ОФІС
ПА ПРАВАХ ЛЮДЗЕЙ
З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Барысенка-Клепач Н. М.

# Інклюзіўны турызм: што, як і навошта?




2016

Асветніцкая праваабарончая ўстанова
«ОФІС ПА ПРАВАХ ЛЮДЗЕЙ З ІНВАЛІДНАСЦЮ»

# Інклюзіўны турызм: што, як і навошта?

Барысенка-Клепач Н. М.

Мінск
2016

# ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ - ШТО ГЭТА?

Інклюзіўны турызм – гэта форма турызму, якая ўключае ў сябе працэс супрацоўніцтва паміж рознымі ўдзельнікамі сферы турызму, які дазваляе людзям з асаблівымі патрэбамі ў даступнасці, уключаючы мабільныя, візуальныя, слыхавыя і кагнітыўныя складнікі даступнасці, дзейнічаць незалежна, на роўных умовах з пачуццём уласнага гонару праз прапанову універсальных турыстычных прадуктаў, паслуг і асяроддзя.

*Сусветная турыстычная арганізацыя (ЮНСТА)*

***Ў літаратуры можна сустрэць таксама іншыя тэрміны: турызм для ўсіх (англ. «tourism for all»), турызм без бар'ераў ці безбар'ерны турызм (англ. «tourism without barriers», ням. «barrier-frei tourismus»), даступны турызм (англ. «accessible tourism») альбо даступны турызм для ўсіх (англ. «accessible tourism for all»). Галоўнае – разумець, што ўсё гэта – пра адно і тое ж.***

***Сусветная турыстычная арганізацыя (ЮНСТА) – спецыялізаваная ўстанова сістэмы ААН, што аб'ядноўвае 157 краін-чальцоў і займаецца развіццём устойлівага і агульнадаступнага турызму. Асноўная міжнародная арганізацыя ў сферы турызму.***

# АДКУЛЬ «НОГІ РАСТУЦЬ», АЛЬБО ТРОХІ ГІСТОРЫІ

**1980**

*Манільская дэкларацыя: ЮНСТА бярэ на сябе абавязак забяспечваць недыскрымінацыйны доступ да турызму.*

**1991**

*Рэзалюцыя ЮНСТА «Стварэнне магчымасцяў для турызму для людзей з інваліднасцю ў дзевяностыя гады».*

**2005**

*Рэзалюцыя ЮНСТА «Турызм, даступны для ўсіх» (утрымлівае спецыялізаваныя рэкамендацыі для розных турыстычных аб'ектаў).*

**2009**

*Дэкларацыя ЮНСТА па спрашчэнні турыстычных вандровак.*

**2011**

*Даклад аб Сусветным камітэце па этыцы турызму, пункт b) Даступны турызм для ўсіх.*

**2012**

*Супрацоўніцтва ЮНСТА з арганізацыямі ў сферы інклюзіўнага турызму Fundación ACS (Іспанія), Fundación ONCE (Іспанія) і ENAT (Еўрапейская сетка даступнага турызму).*

**2013**

*Абнаўленне рэкамендацый ЮНСТА 2005 г. «Турызм, даступны для ўсіх» з улікам палажэнняў Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў.*

**2014**

*1-я канферэнцыя ЮНСТА па інклюзіўным турызме ў Еўропе (Сан-Марына).*

**2015**

*Рэкамендацыі ЮНСТА па даступнай інфармацыі ў сферы турызму.*

**2016**

*Сусветны дзень турызму (27 верасня) прайшоў пад дэвізам «Турызм для ўсіх – прасоўваем усеагульную даступнасць!».*

# ДЛЯ КАГО АКТУАЛЬНЫ ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ?




Кожны з нас у пэўны момант жыцця патрабуе больш камфортных умоў для адпачынку, бо ўсе мы калісьці былі маленькімі, амаль кожны з нас аднойчы вандраваў з вялікімі валізкамі, і любы з нас хоча жыць з задавальненнем у пажылым узросце.

# А ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...







• У свеце каля **785 млн людзей з інваліднасцю – каля 15%** насельніцтва планеты (па дадзеных СААЗ, 2011 г.). Калі ўлічваць чальцоў сямей, дык можна сказаць, што ў свеце **больш як 2 млрд людзей** непасрэдна сутыкаюцца з праблемай інваліднасці.

Больш як **2 млрд людзей – гэта 1/3 насельніцтва планеты!!!**

• Да 2030 г. **1 з 8 чалавек** на зямным шары будзе **старэйшы за 65 год**. Чалавек, якому болей за 65 гадоў, можа мець інваліднасць з верагоднасцю ў 14 разоў болей, чым 4-х гадовы дзіцёнак.

• Да 2050 г. колькасць людзей, якім **болей за 60 гадоў**, будзе складаць **20% сусветнага насельніцтва**.

# ДАСТУПНАСЦЬ – ШТО ГЭТА?

*«Даступнасць – гэта цэнтральны элемент любой сацыяльна-адказнай і ўстойлівай палітыкі ў сферы турызму. Гэта неадменная ўмова выканання правоў чалавека і выключная магчымасць для бізнэсу. Апроч таго, мы павінны прызнаць, што даступны турызм пойдзе на карысць не толькі людзям з інваліднасцю альбо асаблівымі патрэбамі, ад яе выйграем усе мы».*

*Талеб Рыфаі, Генеральны сакратар ЮНСТА*

У Канвенцыі аб правах інвалідаў гаворыцца, што даступнасць выяўляецца ў роўным доступе да:

- фізічнага наваколля;
- транспарту;
- інфармацыі і сувязі, уключаючы інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі і сістэмы;
- іншых аб'ектаў і паслуг, адкрытых для насельніцтва, альбо якія яму прапаноўваюцца, як у гарадскіх, так і ў сельскіх раёнах.

Дзяржавы-ўдзельніцы Канвенцыі, у тым ліку Беларусь, павінны распрацоўваць мінімальныя стандарты, якія прадугледжваюць даступнасць аб'ектаў, паслуг ды інфармацыі, арганізоўваць інструктаж па праблемах даступнасці, развіваць разнастайныя формы аказання дапамогі і падтрымкі людзям з інваліднасцю.

# ТРЫ ПРЫЧЫНЫ ЗРАБІЦЬ СВОЙ ТУРЫСТЫЧНЫ БІЗНЭС ІНКЛЮЗІЎНЫМ

**• Роўныя правы**

Усе людзі без выключэння маюць права на ўдзел у культурным і спартыўным жыцці, турызм і адпачынак.

**• Даступнасць = павышэнне канку- рэнтаздольнасці!**

Даступны турыстычны аб’ект прываблівае большую колькасць турыстаў, падвышаецца ўзровень абслугоўвання, што вядзе да большай задаволенасці і, як вынік, лаяльнасці.

**• Фарміраванне прагрэсіўнага іміджу**

Павышэнне даступнасці Вашага бізнэсу гаворыць пра тое, што Вы ідзяце ў нагу з часам, сочыце за сітуацыяй на рынку і сусветнымі тэндэнцыямі.

***Артыкул 30 Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў гаворыць аб тым, што людзі з інваліднасцю маюць права ўдзельнічаць на роўных з іншымі ў культурным жыцці, правядзенні вольнага часу і адпачынку. У пункце 5 гэтага артыкулу гаворыцца, што «каб надзяліць інвалідаў магчымасцю ўдзельнічаць на роўных з іншымі ў правядзенні вольнага часу і адпачынку і ў спартыўных мерапрыемствах, дзяржавы-ўдзельніцы робяць адпаведныя захады … для забеспячэння таго, каб інваліды мелі доступ да спартыўных, рэкрэацыйных і турыстычных аб’ектаў», а таксама «для забеспячэння таго, каб інваліды мелі доступ да паслуг тых, хто займаецца арганізацыяй вольнага часу, турызму, адпачынку і спартыўных мерапрыемстваў».***

# АБА ШТО «СПАТЫКАЕЦЦА» ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ

- **Інфраструктура**

Будынкі і фізічнае асяроддзе ў цэлым (дарогі, паркі і г.д.) часта недаступны для ўсіх карыстальнікаў.

- **Фінансы**

Выдаткі на паляпшэнне даступнасці часта перабольшваюцца. Напрыклад, калі з самага пачатку будаваць будынак універсальна даступным, выдаткі на будаўніцтва павялічваюцца менш чым на 0,1%.

- **Заканадаўства**

У шматлікіх краінах, у тым ліку ў Беларусі, няма дастатковай колькасці заканадаўчых механізмаў, якія б стымулявалі развіццё інклюзіўнага турызму.

- **Інфармацыя**

Інфармацыя ў дадзеным выпадку мае шмат сэнсаў. Тыя, хто прапануе турыстычныя паслугі, могуць не ведаць, дзе шукаць інфармацыю аб тым, як зрабіць свой бізнэс больш даступным. Турысты з асаблівымі патрэбамі ў даступнасці не могуць знайсці звесткі аб тым, дзе ёсць даступныя ўмовы для турызму і адпачынку, альбо няўпэўненыя ў тым, што інфармацыя праўдзівая.

- **Стаўленне да людзей з інваліднасцю ў цэлым**

Часта персанал не гатовы абслугоўваць турыстаў з інваліднасцю альбо іншымі асаблівымі патрэбамі, што стварае самы адчувальны бар'ер на шляху развіцця інклюзіўнага турызму.

# ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ І ТУРЫСТЫЧНЫ РЫНАК

Агульная сума паступленняў ад турызму ў свеце – **1,5 трыльёны $**



альбо ў сярэднім **4 млрд $** ў дзень (2015 г.)

**ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ –**

**11%**

**СУСВЕТНЫХ ТУРПАТОКАЎ УЖО СЁННЯ**

**ПА ПРАГНОЗАХ ДА 2020 Г. ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ СКЛАДЗЕ**

**22%**

**УСІХ ВЫДАТКАЎ НА ТУРЫЗМ У СВЕЦЕ.**

# ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ У РОЗНЫХ КРАІНАХ

- *73 млн вандровак*
- *17,3 млрд $ - выдаткі на вандроўкі*
- *11% унутранага турызму ЗША*

*Выдаткі на вандроўкі груп, дзе адзін з удзельнікаў мае праблемы здароўя – 12 млрд £ (2015 г.)*

- *Каля 88% людзей з інваліднасцю штогод вандруюць*
- *Агульныя выдаткі на інклюзіўны турызм – 8 млрд $ у год*




- *138,8 млн чалавек патрабуюць даступных умоваў*
- *Людзі з асаблівымі патрэбамі ў даступнасці ажыццявілі 783 млн вандровак у межах ЕС (2012 г.)*
- *Непасрэдны эканамічны ўнёсак інклюзіўнага турызму ў ЕС – 352 млрд € (2012 г.)*
- *У сярэднім, людзі з асаблівымі патрэбамі ў даступнасці вандруюць з 1,9 кампаньёнамі. Калі ўлічыць эфект мультыплікацыі, дык агульны валавы абарот склаў 786 млрд €*

# ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ У БЕЛАРУСІ

По дадзеных Міністэрства працы і сацыяльнай аховы РБ, у краіне пражывае каля **550 тыс.** людзей з інваліднасцю. Гэта амаль **6%** насельніцтва.

**273 месцы** ў санаторыях для людзей, якія карыстаюцца інвалідным вазком.

Каля **1,9 млн.** чалавек пажылога ўзросту (больш за 60 гадоў).

**60 даступных нумароў** у гатэлях (у Мінску).




Больш як **60 тысяч** чалавек маюць розныя віды алергіі.

Каля **20 сядзіб**, прапануюць пэўныя даступныя паслугі.

**Амаль чвэрць** дарослых у Беларусі маюць затлусценне.

**4-5 турфірм** прапануюць варыянты інклюзіўнага адпачынку.

**У ЦЭЛЫМ ПАТЭНЦЫЙНЫ ПОПЫТ НА ІНКЛЮЗІЎНЫ ТУРЫЗМ У БЕЛАРУСІ СКЛАДАЕ КАЛЯ 26% НАСЕЛЬНІЦТВА.**

# ПРЫКЛАДЫ ДАСТУПНЫХ ТУРЫСТЫЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ У БЕЛАРУСІ

Нацыянальны аэрапорт «Мінск»




ГЦ «Замак»



Аквапарк «Лябяжы»



ГЦ «Галерэя Мінск»



Чыжоўка-арэна



# ЯК ЗРАБІЦЬ СВОЙ БІЗНЭС БОЛЬШ ІНКЛЮЗІЎНЫМ?



# 1. ЗЛАДЗІЦЬ «ЛІКБЕЗ» САБЕ І СВАІМ КАЛЕГАМ




**Пачытаць**

Што пачытаць – глядзіце ў раздзеле «Карысныя матэрыялы».




**Паглядзець**

Заўжды лепш паглядзець на свае вочы, як што працуе.



**Паслухаць**

Наведаць семінары па тэме альбо запрасіць экспертаў да сябе ў арганізацыю.



**Паспрабаваць**

Калі сам паспрабаваў, можаш смела прапаноўваць іншым!

# 2. АЦАНІЦЬ ДАСТУПНАСЦЬ СВАІХ ПАСЛУГ



## ІНФРАСТРУКТУРА

Даступнасць інфраструктуры можна ацаніць з дапамогай інструмента маніторынгу. Для гэтага непатрэбна спецыяльных навыкаў. АПУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю» распрацаваныя спецыяльныя анкеты для маніторынгу даступнасці разнастайных турыстычных аб'ектаў (http://www.disright.org/ru/news/itogi-proekta-monitoring-bezbarernoy-sredy). Такі маніторынг дазволіць Вам вызначыць і выдаліць магчымыя недахопы Вашага турыстычнага аб'екта.

## ІНФАРМАЦЫЯ (САЙТ, БРАШУРЫ, БУКЛЕТЫ)

Даступнасць інфармацыі – адзін з ключавых складнікаў даступнасці турызму для ўсіх. Прааналізуйце Ваш сайт і іншыя інфармацыйныя матэрыялы пра Ваш бізнэс на аснове Рэкамендацый ЮНСТА па даступнай інфармацыі ў турызме (http://www. disright.org/be/source). Яшчэ Вы можаце звярнуцца да знешніх экспертаў, якія маглі б, напрыклад, ацаніць даступнасць Вашага сайта для людзей з праблемамі зроку.

# 3. РАСПРАЦАВАЦЬ ДАСТУПНЫ ТУРПРАДУКТ І РАСПАЎСЮДЖВАЦЬ ПРАЎДЗІВУЮ ІНФАРМАЦЫЮ ПРА ЯГО




**Турпрадукт даступны, калі даступныя ўсе яго элементы.** Дадаткова трэба мець спіс дапаможных сэрвісаў для турыстаў з інваліднасцю, які мусіць уключаць сэрвісы па рамонце і замене пратэзаў і абсталявання, ветэрынарныя клінікі для сабак-павадыроў, а таксама пункты аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі.

# І ЯШЧЭ…
# ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ІНКЛЮЗІЎНАГА ТУРЫЗМУ ІСТОТНЫ ДЫЯЛОГ

*Толькі людзі з асаблівымі патрэбамі ў даступнасці могуць распавесці, што ім сапраўды патрэбна*

*Для турыстычнай галіны істотна жаданне і гатоўнасць дзейнічаць для паляпшэння сваёй даступнасці*




*Дзяржава можа распрацаваць заканадаўчыя акты, што будуць садзейнічаць развіццю інклюзіўнага турызму, укараняць стандарты, стымуляваць праз льготы, крэдыты, субсідыі і г.д.*

# КАРЫСНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

1) Канвенцыя ААН аб правах інвалідаў
*http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/disability.shtml*

2) ЮНСТА: Рэкамендацыі ЮНСТА па даступным турызме для ўсіх
*http://www.disright.org/be/source*

3) ЮНСТА: Рэкамендацыі па даступнай інфармацыі ў турызме
*http://www.disright.org/be/source*

4) Маніторынг даступнасці турыстычнага асяроддзя (г. Мінск)
*http://www.disright.org/be/source*

5) Відэаролік аб інклюзіўным турызме https://youtu.be/zG8CR0jZ4Hg

6) Этыкет інваліднасці
*http://www.disright.org/news/ofis-po-pravam-lyudey-s-invalidnostyu-predstavlyaet-etiket-invalidnosti*

7) Інструмент маніторынгу безбар'ернага асяроддзя
*http://www.disright.org/ru/news/itogi-proekta-monitoring-bezbarernoy-sredy*

8) Сайт Еўрапейскай сеткі даступнага турызму ENAT (European Network for Accessible Tourism)
*http://www.accessibletourism.org/*

9) Зборнік анлайн-рэсурсаў аб інклюзіўным турызме ад LonelyPlanet
*http://media.lonelyplanet.com/shop/media/accessible-travel-online-resources.pdf*

10) Сайт аб інклюзіўным турызме ў Барселоне

*http://www.barcelona-access.cat/*

11) Сайт аб інклюзіўных вандроўках па Вялікабрытаніі

*https://www.visitbritain.com/us/en/plan-your-trip/getting-around-britain/accessible-britain*

12) Сайт аб інклюзіўным турызме ў Берліне

*http://www.visitberlin.de/en/plan/city-info/accessible*

## РЭСУРСЫ «ОФІСА ПА ПРАВАХ ЛЮДЗЕЙ З ІНВАЛІДНАСЦЮ»

- **Кансультацыі**
- **Літаратура па тэме**
- **Трэнінгі/семінары**
- **Маніторынг даступнасці**
- **Экспертная падтрымка**

ОФІС
ПА ПРАВАХ ЛЮДЗЕЙ
З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Рэспубліка Беларусь
220029, г. Мінск,
вул. Варанянскага, д. 50/4, офіс 114
www.disright.org
Тэл.+375 (17) 256-08-29



**НАТАЛЛЯ БАРЫСЕНКА-КЛЕПАЧ**, выкладчык факультэта міжнародных адносін БДУ, каардынатар ініцыятыў па інклюзіўным турызме АПУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю», спецыяліст у сферы турызму. У мінулым – менеджар праектаў БГА «Адпачынак у вёсцы». З 2013 г. займаецца даследаваннямі тэмы інклюзіўнага турызму. Аўтар курса пад назвай «Практыка арганізацыі інклюзіўнага турызму» на факультэце міжнародных адносін БДУ. Удзельнік разнастайных праектаў і ініцыятыў, накіраваных на развіццё інклюзіўнага турызму ў Беларусі.

# Інклюзіўны турызм

турызм без выключэнняў

ОФІС
ПА ПРАВАХ ЛЮДЗЕЙ
З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Рэспубліка Беларусь
220029, г.Мінск,
вул. Варанянскага, д. 50/4, офіс 114
www.disright.org
Тэл.+375 (17) 256-08-29